Г.М. Старасціна (Магілёў)

ПЕРАКЛАД АНТРАПОНІМАЎ НА НЯМЕЦКУЮ МОВУ

(НА МАТЭРЫЯЛЕ РАМАНАЎ З "ПАЛЕСКАЙ ХРОНІКІ" І. МЕЛЕЖА)

Сістэму антрапонімаў у мове раманаў "Палескай хронікі" ўтварае лексіка-семантычны разрад асабовых імёнаў, у склад якіх уваходзяць прозвішчы, уласныя асабовыя імёны, імёны па бацьку і мянушкі.

Пераклад прозвішчаў і ўласных асабовых імёнаў у большасці выпадкаў не выклікае цяжкасцей. Часцей за ўсё для іх перадачы на нямецкую мову выкарыстоўваецца транскрыпцыя – такі спосаб перакладу, калі фанетычная форма слова зыходнай мовы перадаецца сродкамі мовы перакладу, напрыклад: бел. *Васіль* – ням. *Wassil*; бел. *Яўхім* – ням. *Jauchim*; бел. *Ганна* – ням. *Hanna*; бел. *Міканор* – ням. *Mikanor*; бел. *Апейка* – ням. *Apejka*; бел. *Харчаў* – ням. *Chartschau* і інш.

Складанасці ўзнікаюць пры перадачы экспрэсіўна-ацэначных антрапонімаў. Часцей за ўсё адценні ласкальнасці, памяншальнасці беларускіх асабовых імёнаў на нямецкую мову не перадаюцца: – *Ой, Гануля! Хадзі сюды!* [2, с. 69] // *"Ach, **Hanna**! Komm, setz dich zu uns!"* [3, с. 86]. У двух выпадках асабовыя імёны з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі транскрыбуюцца: – ***Васілёчак**, каласочак, сынку мой...* [2, с. 62] // *"**Wassiljotschak**, meine Ähre, mein Söhnchen..."* [3, с. 78]. І

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

толькі адзін раз у рамане "Завеі, снежань" ужываецца памяншаль на-ласкальная форма імя *Ганна*, утвораная пры дапамоге нямецка га фарманта *–chen*: – ***Ганначка, самавар гасцям!*** [4, с. 12] // *"**Hannchen**, stell den Samowar für die Gäste auf!"* [5, с. 14].

Цяжкасці ўзнікаюць таксама і пры перакладзе імёнаў на бацьку, бо яны ўжываюцца толькі ў рускіх, беларусаў і ўкраінцаў і не маюць аналагаў ні ў адной мове, у тым ліку і славянскіх. Нягледзячы на гэта, перакладчыкі раманаў транскрыбуюць імя па бацьку: – *Трэба, **Міканор Дамецевіч**, перапісаць усіх, каторыя не явіліся, і, так сказаць, заставіць у абавязковым парадку!* [2, с. 209] // *"Diejenigen, die nicht gekommen sind, **Mikanor Damezewitsch**, muß man aufschreiben, und wir müssen sie sozusagen zwingen, daß sie mitmachen"* [3, с. 271]. Такі пераклад перадае нацыянальную спецыфіку антрапоніма, аднак, з прычыны адсутнасці фонавых ведаў, нямецкамоўны чытач можа зразумець імя па бацьку *Дамецевіч* як прозвішча на – *евіч*.

Найбольшую складанасць пры перакладзе мастацкага тэксту выклікаюць мянушкі. Яны даюцца літаратурнаму персанажу паводле яго фізічных, разумовых і маральных якасцей. У мянушцы пераважае ўнутраная форма, эмацыйна-ацэначнае значэнне, што вельмі важна перадаць пры перакладзе: *Плячысты, з чырвонай шыяй, па-бугаінаму выгнутай галавой, ён цяпер вельмі апраўдваў сваю мянушку, якой яго паціху хрысцілі людзі: **Бугай*** [2, с. 139] // *Breitschultrig, rotnackig, den Kopf vorgebeugt, rechtfertigte er durchaus den Spitznamen "**Stier**", den ihm die Kuranier angehängt hatten* [3, с. 180]. У дадзеным выпадку мянушка адлюстроўвае знешні выгляд персанажа. Семантычная празрыстасць аказіянальнага антрапоніма дае магчымасць яго даслоўнага перакладу на нямецкую мову. Параўн.: бел. *бугай* — ням. *der Stier* ('бык, бугай'). Трэба адзначыць, што пры даслоўным перакладзе захоўваецца ўнутраны сэнс мянушкі, актуалізуецца яе канататыўнае значэнне. Гэтым спосабам перакладаюцца антрапонімы *Корч*, *Чуб*, *Крывароты*, *Руды*. Аднак такія гаваркія імёны, як *Сарока*, *Лясун*, транскрыбуюцца. З гэтай прычыны яны не выконваюць у тэксце перакладу такіх стылістычных функцый, як экспрэсіўная, ацэначна-характарыстычная, не могуць эмацыйна ўздзейнічаць на чытача, у той час як у тэксце арыгінала яны разлічаны на такое ўздзеянне.

Пры перакладзе антрапонімаў трэба таксама ўлічваць, што анамастычная лексіка выклікае нацыянальна-культурныя асацыяцыі. Асабліва гэта датычыцца антрапонімаў, суадносных з апелятывамі-заонімамі, бо ў кожнай нацыянальнай культуры можа быць сваё адметнае стаўленне да жывёл. Так, зайца беларусы атая-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

самліваюць не толькі з баязлівым, гультаяватым чалавекам, але і з жыццяздольным, пладавітым. Гэтыя ўяўленні яскрава адлюстроўваюцца ў мянушцы персанажа Зайчыка, вясёлага і гарэзлівага, у якога шмат дзяцей. У нямецкага народа *заяц* " гэта сімвал смеласці, мудрасці і кемлівасці. Таму, магчыма, з гэтай прычыны, мянушка *Зайчык* транскрыбуецца, бо даслоўны пераклад мог бы прывесці да розных асацыяцый у беларускамоўнага і нямецкамоўнага чытача. Хоць, як было ўжо адзначана вышэй, транскрыпцыя – не самы лепшы спосаб перакладу гаваркіх імёнаў. Існуюць і іншыя спосабы, падрабязна апісаныя В.С. Вінаградавым [1], такія, як відазмяненне слова пры дапамозе анамастычных фармантаў ці без іх, утварэнне найменняў на аснове словазлучэнняў, фразеалагізмаў і інш., аднак перакладчыкі не выкарыстоўваюць гэтых спосабаў. Такім чынам, перадача мянушак з беларускай мовы на нямецкую зводзіцца да транскрыпцыі і даслоўнага перакладу.

Літаратура

1. Виноградов В.С. Перевод: общие и лексические вопросы: Учеб. пособие. Ї 3-е изд. Ї М.: КДУ, 2006. Ї 240 с.
2. Мележ І. Збор твораў: У 10 т. – Мн.: Маст. літ., 1983. – Т. 5: Людзі на балоце: Раман з "Палескай хронікі". – 415 с.
3. Melesh I. Menschen im Sumpf. – Berlin: Verlag Volk und Welt, 1974. – 519 с.
4. Мележ І. Збор твораў: У 10 т. – Мн.: Маст. літ., 1983. – Т. 7: Завеі, снежань: Раман з "Палескай хронікі". – 558 с.
5. Melesh I. Dezember, Stьrme // Sowjetliteratur. – 1981. – № 2. – С.10-99.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова